# АКНО Ў ПАДНЯБЕСНУЮ




**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі створаны Кітайскі цэнтр кнігі. На ўрачыстую цырымонію яго адкрыцця ў нашу краіну прыязджала кітайская дэлегацыя на чале з намеснікам кіраўніка Упраўлення Кітайскай народнай Рэспублікі па справах выдання і распаўсюджвання літаратуры на замежных мовах Юй Тао. Высокі госць адзначыў, што Беларусь стала шаснаццатай краінай свету, дзе адкрыты такі цэнтр.**

Сёння кітайскія цэнтры створаны ў 15 краінах Еўропы, Азіі, Лацінскай Амерыкі. Яны адкрываюцца ў супрацоўніцтве з нацыянальнымі бібліятэкамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, аналітычнымі цэнтрамі. Падобныя сумесныя праекты служаць умацаванню ўзаемаразумення і сувязяў паміж народамі.

Прадстаўнікі кітайскага боку звярнулі ўвагу, што кнігі заўсёды былі крыніцай для набыцця ведаў, асветы і маральнасці, а таксама садзейнічалі выхаванню ўзаемапавагі. Цэнтр кітайскай кнігі ў Нацыянальнай бібліятэцы павінен стаць своеасаблівым акном у Паднябесную, а таксама пляцоўкай для развіцця навуковых і культурных праектаў. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се Сяоюн заўважыў, што цэнтр кнігі – падарунак кітайскага народа беларускаму: “Кніга – гэта адлюстраванне ведаў і мудрасці народа, інструмент для распаўсюджвання культуры, а таксама мост, які аб’ядноўвае народы, краіны”. Кітайская міжнародная камунікацыйная група падабрала і перадала Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі тысячу кніг. Сярод іх – мастацкія творы, кнігі аб гісторыі, культуры, мастацтве, традыцыях Кітая, а таксама літаратура, дзе ахоплены розныя аспекты сучаснага жыцця, палітыкі, эканомікі. Се Сяоюн упэўнены,



што кнігі змогуць пашырыць уяўленне беларускіх чытачоў аб Кітаі, яго мнагамернасці. Ён спадзяецца таксама, што цэнтр будзе садзейнічаць развіццю кітаязнаўства.

Яшчэ тут можна працаваць з часопісамі і дапаможнікамі па вывучэнні кітайскай мовы. Цэнтр будзе карысны самым розным чытачам, тым больш, што кнігі, прадстаўленыя ў ім, не толькі на кітайскай мове, але і на рускай. беларускай, англійскай, французскай.

Першы намеснік міністра культуры Беларусі Валерый Грамада заўважыў, што сёння супрацоўніцтва Беларусі і Кітая мае надзейны фундамент і працягвае актыўна развівацца: "У рамках плана мерапрыемстваў паміж міністэрствамі культуры Беларусі і Кітая на 2023–2025 гады ўжо падпісана і дзейнічае 77 пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж установамі адукацыі і культуры дзвюх краін. Каля













тысячы маладых людзей з Кітая атрымліваюць адукацыю ў беларускіх ВНУ, арганізуюцца адукацыйныя праграмы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі сумесна з кітайскімі ўніверсітэтамі. У мінулым годзе адбыліся гастролі Вялікага тэатра Беларусі па гарадах Кітайскай народнай рэспублікі. Вядучыя артысты тэатра Оперы і балета ўзялі ўдзел у мерапрыемствах міжнароднага фестывалю мастацтваў "Шаўковы шлях". Нашы кітайскія сябры – пастаянныя ўдзельнікі міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар" у Віцебску, Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад," у рамках якога праходзяць дні кітайскага кіно".

Яўген **Кручкоў**

фота Алены Дзядзюлі